# Раздзел III. БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х — ПАЧАТКУ 1990-х гг.

## *§ 42–0. Свет у другой палове 40-х — пачатку 90-х гг. ХХ ст.

ЯЛЦІНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ
ПАТСДАМСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ
ААН «ХАЛОДНАЯ ВАЙНА»
ДЭКАЛАНІЗАЦЫЯ АВД
НАТА ПЛАН МАРШАЛЛА

**1. Ялцінска-Патсдамская сістэма міжнародных адносін.** Асноўныя прынцыпы міжнародных адносін па выніках Другой сусветнай вайны былі выпрацаваны падчас дзвюх канферэнцый саюзных дзяржаў — Ялцінскай і Патсдамскай. На гэтых сустрэчах лідары краін *антыгітлераўскай кааліцыі* — СССР, ЗША і Вялікабрытаніі — узгаднілі ключавыя пытанні наконт будучыні пасляваеннай Еўропы і свету ў цэлым.

Успомніце, якую ролю адыграла БССР у заснаванні ААН. Чым была абумоўленая роля БССР у стварэнні міжнароднай арганізацыі?

На канферэнцыі ў Сан-Францыска (25 красавіка — 26 чэрвеня 1945 г.) былі падпісаныя пагадненні аб стварэнні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН) — міжнароднай арганізацыі, закліканай гарантаваць бяспеку і супрацоўніцтва паміж краінамі. У Статуце ААН мэтай арганізацыі было прапісана «пазбавіць наступныя пакаленні ад бедстваў вайны».

| Рашэнні Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцый | |
|---|---|
| **Ялцінская канферэнцыя**<br>(4–11 лютага 1945 г.) | **Патсдамская канферэнцыя**<br>(17 ліпеня — 2 жніўня 1945 г.) |
| **Аб пасляваенным уладкаванні Германіі.** Падзел Германіі на чатыры акупацыйныя зоны — савецкую, амерыканскую, брытанскую і французскую, а г. Берліна — на чатыры акупацыйныя сектары | **Пасляваеннае кіраванне Германіяй.** Пацверджаны і ўдакладнены ўмовы акупацыі, дэмілітарызацыі, дэнацыфікацыі краіны. Узгоднены прынцыпы дэмакратызацыі Германіі, у тым ліку аднаўленне грамадзянскіх свабод (слова, прэсы, рэлігіі і інш.), падзел улады, дазвол дзейнасці дэмакратычных партый. Вырашана арганізаваць міжнародны суд над лідарамі злачыннага фашысцкага рэжыму |
| **Аб дэмілітарызацыі і дэнацыфікацыі Германіі.** Пасляваенная дэмілітарызацыя — ліквідацыя ўзброеных сіл, запасаў зброі, ваенна-прамысловага комплексу; дэнацыфікацыя — ліквідацыя нацыянал-сацыялістычнай ідэалогіі, знішчэнне нацысцкай партыі і іншых нацысцкіх арганізацый, «ачышчэнне» нямецкага грамадства ад усялякага нацыянал-сацыялістычнага ўплыву, а таксама пакаранне ваенных злачынцаў | **Ваенныя рэпарацыі.** Дамовіліся наконт сістэмы рэпарацый, згодна з якой СССР мог забіраць прамысловае абсталяванне і рэсурсы са сваёй зоны акупацыі, ЗША і Вялікабрытанія атрымлівалі свае рэпарацыі з заходніх зон Германіі<br><br>**Тэрытарыяльныя змены ў Еўропе.** Пацверджана перадача Усходняй Прусіі і некаторых іншых тэрыторый СССР і Польшчы. СССР перадавалася частка Усходняй Прусіі з горадам Кёнігсберг (цяпер г. Калінінград, Калінінградская вобласць Расійскай Федэрацыі). Гэтыя тэрытарыяльныя змены вызначалі новыя межы і былі накіраваныя на ўмацаванне геапалітычнай стабільнасці ў Еўропе |
| **Польскае пытанне.** Замацаваны ўваход у склад СССР Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Польшча атрымала значную частку нямецкіх тэрыторый на захадзе і поўначы. Урад краіны ствараўся на аснове камуністычнага Часовага ўрада, што размяшчаўся ў Любліне | **Японскае пытанне.** Ад імя трох дзяржаў — ЗША, Вялікабрытаніі і Кітая — была прынятая Патсдамская дэкларацыя па Японіі. Дакумент патрабаваў ад Японіі безадмоўнай капітуляцыі, у выпадку адмовы саюзнікі пагражалі «хуткім і поўным знішчэннем».<br>СССР, верны сваім саюзніцкім абавязацельствам, пацвердзіў свой удзел у вайне супраць Японіі ў абмен на атрыманне Курыльскіх астравоў і Паўднёвага Сахаліна, страчанага ў выніку руска-японскай вайны 1904–1905 гг. |

У чым заключаліся дэмілітарызацыя, дэнацыфікацыя і дэмакратызацыя Германіі пасля Другой сусветнай вайны?
Якім чынам рашэнні Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцый паўплывалі на расстаноўку сіл на міжнароднай арэне?

### Значэнне Ялцінска-Патсдамскай сістэмы міжнародных адносін

Ялцінска-Патсдамская сістэма міжнародных адносін заклала асновы пасляваеннага светаўладкавання. Яна вызначыла зоны ўплыву, тэрытарыяльныя змены і прынцыпы міжнароднага ўзаемадзеяння. Гэта быў своеасаблівы кампраміс паміж вялікімі дзяржавамі, інтарэсы і ідэалогіі якіх не супадалі.

## Працуем з гістарычнай крыніцай

**Са Статута ААН**

Прэамбула.

Мы, народы аб'яднаных нацый, поўныя рашучасці пазбавіць наступныя пакаленні ад бедстваў вайны, якая двойчы ў нашым жыцці прынесла чалавецтву невыказнае гора, і зноў зацвердзіць веру ў асноўныя правы чалавека, у вартасць і каштоўнасць чалавечай асобы, у раўнапраўе мужчын і жанчын і ў роўнасць правоў вялікіх і малых нацый, і стварыць умовы, пры якіх могуць выконвацца справядлівасць і павага да абавязкаў, … і спрыяць сацыяльнаму прагрэсу і паляпшэнню ўмоў жыцця пры большай свабодзе…

Арт. 41.

Савет Бяспекі ААН упаўнаважваецца вырашаць, якія захады, не звязаныя з выкарыстаннем узброеных сіл, павінны рабіцца для ажыццяўлення яго рашэнняў, і ён можа запатрабаваць ад членаў Арганізацыі здзяйснення гэтых захадаў. Гэтыя захады могуць уключаць поўны або частковы разрыў эканамічных адносін, чыгуначных, марскіх, паветраных, паштовых, тэлеграфных, радыё- або іншых сродкаў зносін, а таксама разрыў дыпламатычных адносін.

Арт. 42.

Калі Савет Бяспекі палічыць, што захады, прадугледжаныя ў арт. 41, могуць аказацца недастатковымі або ўжо аказаліся недастатковымі, ён упаўнаважваецца ажыццяўляць такія дзеянні паветранымі, марскімі або сухапутнымі сіламі, якія акажуцца неабходнымі для падтрымання або аднаўлення міжнароднага міру і бяспекі. Такія дзеянні могуць уключаць дэманстрацыі, блакаду і іншыя аперацыі паветраных, марскіх або сухапутных сіл членаў Арганізацыі.

*1. Якія задачы ставіць перад сабой ААН?*

*2. Якія захады, згодна са Статутам ААН, павінны рабіцца для вырашэння дадзеных задач?*

Сістэма таксама зацвердзіла прынцыпы калектыўнай бяспекі, у прыватнасці, ролю ААН у вырашэнні канфліктаў.

**2. Фарміраванне двухполюснага свету.** Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны найбольшым уплывам у свеце карысталіся дзве вялікія дзяржавы — СССР і ЗША. Свет падзяліўся на два

Дзве грамадска-палітычныя сістэмы — два блокі

## РАБОТАЕМ С ИСТОРИЧЕСКИМ ИСТОЧНИКОМ

**Из выступления Уинстона Черчилля в г. Фултон, США, 5 марта 1946 г.**

Никто не может сказать, чего можно ожидать в ближайшем будущем от Советской России и руководимого ею международного коммунистического сообщества и каковы пределы… их экспансионистских устремлений и настойчивых стараний обратить весь мир в свою веру…

Общаясь в годы войны с нашими русскими друзьями и союзниками, я пришел к выводу, что больше всего они восхищаются силой и меньше всего уважают слабость, в особенности военную.

Поэтому мы должны отказаться от изжившей себя доктрины равновесия сил, или, как ее еще называют, доктрины политического равновесия между государствами. Мы не можем и не должны строить свою политику, исходя из минимального преимущества и тем самым провоцируя кого бы то ни было померяться с нами силами.

Мне трудно представить, чтобы обеспечение эффективных мер по предотвращению новой войны… было возможно без создания того, что я бы назвал братским союзом англоязычных стран. Под этим я имею в виду особые отношения между Великобританией и Британским Содружеством наций, с одной стороны, и Соединенными Штатами Америки — с другой…

1. *В чем У. Черчилль видел усиление СССР?*
2. *Что он предлагал противопоставить СССР?*
3. *Какие слова из выступления У. Черчилля, по вашему мнению, можно считать призывом к гонке вооружений? Свое мнение объясните.*
4. *По мнению современных политологов, речь У. Черчилля в г. Фултон положила начало новой эпохе в истории человечества, для которой характерна готовность западных англоязычных стран «на основе военной силы» навязывать любым государствам свой образ демократии. Какие суждения из выступления У. Черчилля позволяют сделать такой вывод?*

Успомніце, як змянілася знешняя палітыка ЗША пасля Другой сусветнай вайны. У чым заключалася дактрына Трумэна?

супрацьлеглыя блокі (полюсы): заходні, капіталістычны, на чале са Злучанымі Штатамі Амерыкі і ўсходні, сацыялістычны, на чале з Савецкім Саюзам. Гэты раскол быў абумоўлены ідэалагічнымі, палітычнымі і эканамічнымі адрозненнямі паміж дзвюма грамадска-палітычнымі сістэмамі — капіталізмам і сацыялізмам. Супрацьстаянне паміж імі ўвайшло ў гісторыю пад назвай *«халодная вайна»*. Пачатак ёй паклала выступленне У. Чэрчыля ў г. Фултан (ЗША).

### Стварэнне НАТА і АВД

Успомніце, у чым заключаўся план Маршала. Чаму яго рэалізацыя азначала рост уплыву ЗША ў Заходняй Еўропе?

У 1947 г. пачалася агрэсіўная кансалідацыя сіл Захаду ў барацьбе супраць СССР. Асноўным сродкам уплыву ЗША на краіны Заходняй Еўропы выступілі *план Маршала* і ваенна-палітычны блок *НАТА* (Арганізацыя Паўночнаатлантычнай дамовы, 1949 г.).

Рэакцыяй на фарміраванне НАТА і ўмацаванне заходніх краін было аб'яднанне сацыялістычных дзяржаў спачатку ў рамках *Савета Эканамічнай Узаемадапамогі* (СЭУ, 1949 г.), затым *Арганізацыі Варшаўскага дагавора* (АВД, 1955 г.). Удзельнікі СЭУ імкнуліся да інтэграцыі сваіх эканомік і каардынацыі планаў развіцця. АВД стваралася як ваенна-палітычны саюз у адказ на ўваход ФРГ у НАТА.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце кароткую даведку пра Карыбскі крызіс: час, месца, удзельнікі, прычыны, сутнасць, наступствы.

Стварэнне ваенна-палітычных блокаў паклала пачатак гонцы ўзбраенняў, у тым ліку ядзерных. Ваенныя канфлікты, такія як *Карэйская вайна* (1950–1953 гг.) і *вайна ў В'етнаме* (1965–1973 гг.), абвастрылі супрацьстаянне. Вельмі вострым міжнародным канфліктам быў *Карыбскі крызіс* 1962 г.: паводле ацэнкі палітыкаў, свет быў на мяжы сусветнай ядзернай вайны.

### Разрадка міжнароднай напружанасці

Успышкі «халоднай вайны» паміж дзвюма грамадска-палітычнымі сістэмамі чаргаваліся з перыядамі разрадкі міжнароднай напружанасці. Так, у 1972 г. былі заключаныя савецка-амерыканскія дамовы аб абмежаванні сістэм супрацьракетнай аба-

роны (СРА) і аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў (АСУ-1). Абодва бакі прызналі парытэт роўнасці сваіх стратэгічных сіл і неабходнасць яго захавання як асновы ўстойлівых мірных адносін.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ




*Разгледзьце плакат і адкажыце на пытанні:*

1. *Якому перыяду міжнародных адносін прысвечаны гэты плакат?*
2. *Якія падзеі прадстаўлены на плакаце? Складзіце кароткую гістарычную даведку пра адну з іх (час, месца, удзельнікі, прычыны, сутнасць, наступствы).*
3. *Хто з палітычных дзеячаў паказаны на плакаце? Складзіце кароткую гістарычную даведку пра аднаго з іх.*
4. *Дайце назву гэтаму плакату.*

У 1975 г. у Хельсінкі адбылася *Нарада па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе* (НБСЕ) з удзелам ЗША, Канады і 33 еўрапейскіх дзяржаў. Удзельнікі нарады падпісалі Заключны акт, у якім давалі ўзаемныя абавязацельствы паважаць цэласнасць існуючых межаў дзяржаў, іх суверэнітэт, базавыя правы чалавека, рабіць захады па ўмацаванні міжнароднай бяспекі.

**Паварот да канфрантацыі**

Аднак на мяжы 1970–1980-х гг. у міжнародных адносінах адбыўся новы віток канфрантацыі паміж СССР і ЗША. У 1983 г. Вялікабрытанія, ФРГ і Італія ўзгаднілі размяшчэнне амерыканскіх ядзерных ракет на сваіх тэрыторыях. Савецкае кіраўніцтва ўспрыняла гэта як прамую пагрозу для бяспекі краіны і як агрэсію, якая патрабуе актыўных дзеянняў. Адказам на такія захады было не толькі нарошчванне ваеннай магутнасці, але і ўзмацненне дыпламатычных і прапагандысцкіх намаганняў, скіраваных на абарону інтарэсаў СССР і прадухіленне магчымых канфліктаў.

**3. Крах каланіяльнай сістэмы.** Крах каланіяльнай сістэмы стаў важнай падзеяй другой паловы XX ст., якая паўплывала на палітычную карту свету. Актыўная фаза гэтага працэсу ахоплівае 1945–1970-я гг., калі найбуйнейшыя каланіяльныя імперыі Еўропы пачалі губляць кантроль над сваімі заморскімі тэрыторыямі. Адбывалася *дэкаланізацыя* — калоніі еўрапейскіх краін у Азіі і Афрыцы набывалі палітычную незалежнасць.

Успомніце, што такое каланіялізм. Калі сфарміравалася каланіяльная сістэма?

Краху каланіяльнай сістэмы спрыялі таксама сацыяльныя і культурныя фактары. Да гэтага часу ў многіх краінах Азіі і Афрыкі вырасла новае пакаленне, якое атрымала еўрапейскую адукацыю. Яно крытычна ставілася да каланіялізму і было прыхільнікам ідэй нацыянальнага вызвалення. Маладыя лідары ўзначалілі рух антыкаланіяльнага і сацыяльнага пратэсту, барацьбу за незалежнасць

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*Разгледзьце картасхему і адкажыце на пытанні.*




1. *Якія тэрыторыі знаходзіліся ў каланіяльнай залежнасці пасля канца Другой сусветнай вайны? Якія дзяржавы валодалі калоніямі?*
2. *1960 год быў абвешчаны «Годам Афрыкі». Як вы лічыце, з якімі падзеямі гэта звязана?*
3. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, што такое Рух недалучэння. З якой мэтай ён быў створаны?*

**ПРЫЧЫНЫ ДЭКАЛАНІЗАЦЫІ**

- Аслабленне еўрапейскіх дзяржаў пасля Другой сусветнай вайны
- Падтрымка дэкаланізацыі з боку ААН
- Актывізацыя нацыянальна-вызваленчых і антыкаланіяльных рухаў у Азіі і Афрыцы
- Падтрымка нацыянальна-вызваленчых рухаў з боку СССР і ЗША

Растлумачце, якім чынам прадстаўленыя з'явы паспрыялі працэсу дэкаланізацыі.

і аднаўленне культурных традыцый, падарваных у каланіяльны перыяд.

### Сродкі дасягнення незалежнасці

Да пачатку 1970-х гг. большасць былых калоній у Азіі і Афрыцы атрымалі незалежнасць. Сродкі дасягнення незалежнасці былі розныя. Індыя, напрыклад, здабыла незалежнасць у 1947 г. мірным шляхам. А народу Алжыра давялося ад 1954 да 1962 г. весці працяглую ўзброеную барацьбу супраць французскіх каланізатараў, якая суправаджалася вялікімі чалавечымі стратамі.

### Вынікі дэкаланізацыі

Дэкаланізацыя завяршыла эпоху каланіяльных імперый, паспрыяла фарміраванню свету, заснаванага на імкненні да рэальнага суверэнітэту і роўнасці новых дзяржаў. Аднак каланіяльная спадчына дасюль нагадвае аб сабе. Многія юрыдычна самастойныя краіны Азіі і Афрыкі апынуліся ў рознай ступені залежнасці ад сваіх былых метраполій, што стала сур'ёзнай перашкодай на шляху іх сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця.

*Пасля Другой сусветнай вайны свет аказаўся падзелены на два працілеглых лагеры — капіталістычны і сацыялістычны, што прывяло да эпохі «халоднай вайны». Гэтая напружаная атмасфера вызначыла міжнародныя адносіны на многія гады. Адначасова з гэтым у Азіі і Афрыцы адбываўся актыўны працэс дэкаланізацыі, у выніку якога многія былыя калоніі здолелі здабыць палітычную незалежнасць. Гэты гістарычны перыяд стаў важнай вяхой у барацьбе народаў за свае правы і свабоды, радыкальна змяніўшы палітычную карту свету і паўплываўшы на далейшае развіццё міжнароднай палітыкі.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| 25 красавіка — 26 чэрвеня 1945 г. — канферэнцыя ў г. Сан-Францыска (ЗША), на якой створана ААН | 26 чэрвеня 1945 г. — беларуская дэлегацыя ў ліку іншых дэлегацый падпісала ў Сан-Францыска Статут ААН. БССР стала заснавальнікам ААН |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія рашэнні, прынятыя на Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцыях, на вашу думку, былі ў першую чаргу скіраваныя на прадухіленне новай сусветнай вайны? Сваю думку аргументуйце.
2. На падставе тэксту параграфа вызначце прыкметы двухполюснага свету, які сфарміраваўся пасля Другой сусветнай вайны. Канкрэтызуйце фактамі прыкметы двухполюснага свету.
3. Назавіце фактары, якія паспрыялі дэкаланізацыі краін Азіі і Афрыкі пасля Другой сусветнай вайны.
4. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, ахарактарызуйце асноўныя кірункі дзейнасці нашай рэспублікі ў складзе ААН.